**Бялоў, Дз.** Захапляючыя акорды свята / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. – 2012. – 25 ліпеня. – С. 2; Белорусская нива. – 2012. – 24 июля. – С. 4; Вечерний Брест. - 2012. - 26 июля. – С. 5; Кобрин-информ. – 2012. – 26 июля. – С. 4.

Кобрынская  цэнтральная бібліятэка падрыхтавала шэраг мерапрыемстваў да Дня горада

**Захапляючыя акорды свята**

Кобрын адзначыў 725-годдзе. На другі дзень свята Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка падрыхтавала для ўсіх гасцей шэраг цікавых мерапрыемстваў. Карысталіся папулярнасцю кніжныя выставы, дзеці з захапленнем удзельнічалі ў конкурсе малюнкаў на асфальце. А побач усе жадаючыя проста на вуліцы мелі магчымасць атрымаць асалоду ад творчасці клуба “Сустрэча”. Аб праграме, якую падрыхтавала да свята бібліятэка, нам расказала загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі Ларыса Цвяткова.

- Наша праграма прысвечана не толькі 725-годдзю Кобрына, але і Году кнігі. Менавіта таму сёння мы вынеслі на вуліцу ўсе нашы кніжныя выставы, каб людзі атрымалі магчымасць пазнаёміцца з усім тым, што прапаноўвае наша бібліятэка”.

*Дзмітрый БЯЛОЎ.*